Перарываючы маўчанне

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
07.03.2021 00:00



Неаднойчы мы чулі пра аб’яўленні Найсвяцейшай Панны Марыі, якая з’яўлялася людзям у розных кутках свету – ад Мексікі да Японіі, – амаль кожны раз пакідаючы вернікам заўсёды актуальнае пасланне. Разам з тым, гісторыя Касцёла ведае выпадкі аб’яўленняў самай маўклівай постаці Евангелля – св. Юзафа, які таксама пакінуў тым, хто яго бачыў, такое чаканае слова. Аб’яўленне св. Юзафа ў Катыньяку ў Францыі

Першае аб’яўленне св. Юзафа адбылося ў невялікім мястэчку ў Правансе. Менавіта там 7 чэрвеня 1660 года св. Апякун Марыі і Езуса з’явіўся перад французскім пастухом. Гаспард Рыкард пасвіў статак на ўзгорку Бесіён. Было горача, і малады чалавек быў надзвычай стомлены і знясілены ад смагі. У нейкі момант ён убачыў мужчыну, які ўказаў на скалу і прамовіў толькі некалькі слоў: “Я Юзаф. Падымі камень і будзеш піць”. † Гаспард завагаўся. Камень быў цяжкі, і каб яго перамясціць, трэба было некалькі чалавек. Тым не менш ён выканаў наказ і адсунуў камень. Убачыў крыніцу, з якой лілася вада. Праз некалькі гадзін пасля гэтай сустрэчы крынічка ператварылася ў фантан з вялікай колькасцю вады. З тых часоў у гэтае месца сталі прыходзіць людзі, і пачаліся шматлікія выздараўленні.

Перарываючы маўчанне

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
07.03.2021 00:00



[redacted]ейшай П